УДК 619:618.5-084

К. Д. ВАЛЮШКІН, А. П. КУРЗЕКА

ПРАФІЛАКТЫКА ЗАТРЫМАННЯ ПАСЛЕДУ Ў КАРОЎ

У цяперашні час выдзяляюць дзве асноўныя прычыны затрымання паследу ў кароў: зніжэнне скарачальнай функцыі маткі (гіпатанія) і трывалае зрашчэнне варсінак харыёна з яе слізістай абалонкай [4, 6]. Развіццё злучальна-тканкавых элементаў у матцы і гіпатанія ўзнікаюць пры парушэнні абмену рэчываў з-за непаўнацэннага кармлення жывёлін, хібнасцей у іх доглядзе, адсутнасці актыўнага мацыёну. Значыць, у аснову прафілактыкі затрымання паследу і паталогіі пасляродавага перыяду ў кароў павінен быць пакладзены комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне рэзістэнтнасці арганізма ў цэлым і стымуляцыю актыўнасці маткі [6].

Першараднае значэнне ва ўзнаўленні жывёлы мае вітамін А, які прымае ўдзел у рэгуляцыі акісляльна-аднаўленчых працэсаў у тканках,